*УДК [811.161.3+811.112.2]'373.7:159.942*

# САМАТЫЧНЫЯ ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ ЯК СРОДКІ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ЭМОЦЫЙ (НА МАТЭРЫЯЛЕ БЕЛАРУСКАЙ І НЯМЕЦКАЙ МОЎ)

**Ганна Старасціна**

*Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова*
*Mogilev State A. Kuleshov University*
*вул. Касманаўтаў, 1, Магілёў, 212022, Рэспубліка Беларусь*
*starostina@msu.by*

Старостіна А. Соматичні фразеологізми як засіб репрезентації емоцій (на матеріалі білоруської та німецької мов)

У статті досліджено семантичні характеристики білоруських і німецьких соматичних фразеологізмів, що репрезентують категорію емоцій. Виявлено фразеологічну активність соматичних лексем, проаналізовано фразеологізми з високочастотними соматичними компонентами. З'ясовано тип міжмовної фразеологічної еквівалентності, виокремлено загальне й специфічне у значенні та функціонуванні стійких одиниць двох мов, які відображають універсальне бачення світу, вирізняються фразоутворювальною активністю, що підвищує ступінь міжмовної еквівалентності. Акцентовано на загальних і національних особливостях.

*Ключові слова*: переклад, еквівалентність, соматична фразеологія, категорія емоцій.

Starostina A. Somatic phraseological units as a means of representing emotions (based on the material of the Belarusian and German languages)

The article deals with the the semantic characteristics of the Belarusian and German somatic phraseological units representing emotions. The phraseological activity of somatic lexemes is revealed, phraseological units with high-frequency somatic components are analyzed. The type of interlingual phraseological equivalence is determined. Full equivalents are identified, characterized by the same semantics, component composition, and similar structure; partial equivalents having the same meaning, similar or different structure and different component composition; non-equivalent phraseological units, characterized by the absence of direct analogs in the language of comparison. The general and specific in the meaning and functioning of stable units of two languages are determined.

As the examples show, somatic phraseologies in both Belarusian and German represent mostly negative emotions, such as fear, shame, sadness, anger, envy, despair. Positive emotions are transmitted much less often. This reflects the similarity of the Belarusian and German language picture of the world. National distinctiveness is manifested in the absence of exact equivalents, which is explained

© Г. Старасціна, 2020. 

by both linguistic and extralinguistic factors. It is noted that the phraseologisms of the two languages have a high interlingual equivalence. This is due to the fact that these components are part of the common and ancient vocabulary of each language, equally understood in the culture of these countries and have a high phrase-forming activity. These factors increase the degree of interlingual equivalence.

Thus, a comparative analysis of phraseological units allowed us to elucidate some universal and specific features of stable units of two languages. The actual material will be useful in compiling a translation dictionary of somatic phraseology, in teaching special courses on translation practice.

*Key words*: translation, equivalence, somatic phraseological units, category of emotions.

**Пастаноўка праблемы і яе сувязь з важнымі навуковымі задачамі**. Вывучэнню моўнай свядомасці народа ў сучаснай лінгвістыцы прысвечыны шэраг публікацый, у якіх даследуюцца фрагменты моўнай карціны свету, звязаныя з традыцыямі і асаблівасцямі нацыянальнай культуры, што дазваляе рэканструяваць сістэму архаічнага мыслення народа. Для нашага даследавання асаблівую цікавасць уяўляе саматычная фразеалогія, якая прайшла працяглы шлях развіцця, выступае транслятарам цэлага комплексу асацыяцый і дазваляе ахарактарызаваць асаблівасці светаразумення і светаўспрымання народа. Відавочна, што найбольш яскрава нацыянальная адметнасць мовы выяўляецца ў працэсе супастаўлення яе з іншай мовай. Гэтым і абумоўлена актуальнасць нашага даследавання, якое накіравана на вывучэнне саматычных фразеалагізмаў, рэпрэзентуючых эмоцыі, у супастаўляльным плане ў межах няблізкароднасных моў. Менавіта комплексны параўнальна-супастаўляльны аналіз беларускіх і нямецкіх саматычных фразеалагізмаў дазваляе выявіць тыя архаічныя ментальныя ўстаноўкі, прадстаўленні і стэрэатыпы, якія знайшлі адлюстраванне ў моўнай карціне свету двух народаў.

**Аналіз апошніх даследаванняў і публікацый**. У апошнія гады шматлікія навукоўцы займаюцца даследаваннем фразеалогіі ў лінгвакультуралагічным і кагнітыўным аспектах, што звязана з развіццём антрапалагічнага напрамку лінгвістыкі, дзе моўныя з'вы вывучаюцца ў цеснай сувязі з культурай, мысленнем і дзейнасцю чалавека. Разнастайныя аспекты даследавання фразеалагізмаў у кантэксце культуры разглядаюцца ў працах В. Арцёмавай [Arcyomava / Арцёмава 2013], А. Дзядовай

 © Г. Старасціна, 2020.

[Dzyadova / Дзядова 2013], У. Коваля [Koval' / Коваль 2011], М. Каўшовай [Kovshova / Ковшова 2016], В. Ляшчынскай [Lyashchynskaya / Ляшчынская 2015], В. Маславай [Maslova / Маслова 2011], Я. Іванова [Ivanov / Іваноў 2017] і інш.

Адно з ключавых месцаў у сучасным мовазнаўстве займае даследаванне вербалізацыі эмоцый, а менавіта ўстанаўленне сістэмных характарыстык катэгорыі эматыўнасці з вызначэннем агульных і нацыянальна-спецыфічных рыс. Дадзеныя, атрыманыя навукоўцамі ў галіне псіхалогіі, фізіялогіі, дапамагаюць у распрацоўцы лінгвістычных праблем эмоцый. Сутнасць лінгвістычнага падыходу сфармуляваў В. Шахоўскі наступным чынам: “Фіксацыя эмацыйных працэсаў праходзіць з дапамогай псіхічнага механізму іх адлюстравання ў семантыцы слоў, якія выкарыстоўваюцца для вербалізацыі эмацыйных адносін. Адлюстраванне відавага вопыту эмацыйнага стану лакалізуецца ў сэнсавай структуры адпаведных слоў-вобразаў тых аб’ектаў, з якімі яны суадносяцца. Гэта адлюстраванне кадзіруецца ў слове спецыфічнымі кампанентамі яго семантыкі, якія і фарміруюць эматыўнасць слова” [Shakhovskiy / Шаховский 2008 : 5].

В. Ляшчынская адзначае, што “эматыўнасць у лінгвістыцы разглядаецца як самастойная катэгорыя, якая рэалізуецца на розных узроўнях мовы, але менавіта фразеалагічны ўзровень кожнай мовы скіраваны на выражэнне эмоцый, пачуццяў і псіхалагічных станаў і валодае выразнай адметнасцю ў параўнанні з лексічным” [Lyashchynskaya / Ляшчынская 2012 : 146].

У нашым даследаванні мы спынімся на прыкладах вербалізацыі эмоцый з дапамогай саматычнай фразеалогіі. Як адзначае В. Шубіна: “Эмоцыі і псіхічны стан чалавека выяўляюцца большай часткай менавіта праз саматычныя фразеалагізмы, магчымасці якіх у гэтым плане сапраўды вялікія” [Shubina / Шубина 1977 : 82].

**Мэта даследавання** заключаецца ў вызначэнні агульных і адметных рыс у семантыцы беларускамоўных і нямецкамоўных саматычных фразеалагічных адзінак, рэпрэзентуючых эмоцыі, у выяўленні закадзіраваных у іх унутранай форме універсальных і нацыянальных элементаў моўнай свядомасці.

© Г. Старасціна, 2020. 

**Выклад асноўнага матэрыялу даследавання**. Эмацыянальна-псіхічнае жыццё чалавека цесна звязана з семантыкай шматлікіх саматычных фразеалагізмаў. Эмоцыі з'яўляюцца своеасаблівай формай адлюстравання рэальнага працэсу ўзаемадзеяння чалавека з навакольным асяроддзем. У гэтым працэссе чалавек не застаецца абыякавым да ўсяго, што знаходзіцца вакол яго, у яго ўзнікаюць перажыванні, якія выражаюць суб'ектыўныя адносіны да гэтых з'яў.

У працэсе аналізу саматычных фразеалагічных адзінак беларускай і нямецкай моў, рэпрэзентуючых эмоцыі, былі вылучаны дамінантныя саматычныя кампаненты. Разгледзім найбольш частотныя з іх.

Саматычныя кампаненты *вока / вочы (das Auge / die Augen)* з'яўляюцца важным выразнікам пачуццяў і эмоцый, "пры дапамозе зроку чалавек спазнае навакольную рэчаіснасць. Тое, што ён бачыць, выклікае ў яго станоўчыя ці адмоўныя эмоцыі" [Starastsina / Старасціна 2019 : 106]. Саматызм вока / вочы ў складзе фразеалагічных адзінак рэпрэзентуе розныя віды эмоцый: 1) ***здзіўленне***: бел. *вочы на лоб лезуць* ('хто-н. выказвае вялікае здзіўленне') – ням. *die Augen springen aus dem Kopf* ('вочы на лоб лезуць'); 2) ***сорам***: бел. *адводзіць вочы* ('падманваць, хаваць вочы ад сораму') – ням. *die Augen niederschlagen* ('апусціць вочы'); 3) ***смутак***: бел. *вочы на мокрым месцы* ('хтосьці часта плача або гатовы заплакаць') – ням. *die Augen gehen ihm über* ('на вачах выступілі слёзы'); 4) ***зайздрасць***: бел. *коле вочы* ('што-н. выклікае зайздрасць; што-н. неадчэпна прыцягвае ўвагу') – ням. *in die Augen stechen* ('кідацца ў вочы; абуджаць жаданне мець што-н.').

Саматызмы *сэрца / душа (das Herz / die Seele)* сімвалізуюць пэўныя пачуцці і перажыванні чалавека, таму даволі часта фразеалагічныя адзінкі з такімі кампанентамі актуалізуюць наступныя эмоцыі: 1) ***гнеў***: бел. *мець сэрца* ('зліцца на каго-небудзь') – ням. *sich (D) das Herz aus dem Leibe ärgern* ('лопацца ад злосці'); 2) ***страх***: бел. *душа ў пяткі схавалася* ('каго-небудзь ахоплівае моцны страх') – ням. *das Herz fiel ihm in die Hosen* ('душа сыходзіць у пяткі'); 3) ***хваляванне***: бел. *душа не на месцы* ('хтосьці адчувае трывогу, неспакой') – ням. *j-m. schlägt das Herz im Halse* ('сціскае горла ад хвалявання'); 4) ***смутак***:

 © Г. Старасціна, 2020.

бел. *кроіць сэрца* (‘выклікаць моцны душэўны боль’) – ням. *j-m. tat das Herz im Leibe weh* (‘сэрца сціснулася’).

Як паказваюць даследаванні [Starastsina / Старасціна 2018; Starastsina / Старасціна 2020], лексему *душа* трэба лічыць лакунарнай адзінкай, бо ўстойлівым беларускамоўным словазлучэнням з гэтым кампанентам у нямецкай мове часта адпавядаюць фразеалагімы з кампанентам *сэрца*.

Саматызм *галава (der Kopf)* служыць для абазначэння галоўнай, жыццёва важнай часткі цела чалавека і здольны актуалізаваць такія эмоцыі як: 1) ***смутак***: бел. *вешаць (апускаць) галаву* (‘здавацца, адчуваць моцны смутак’) – ням. *den Kopf in den Schoß sinken lassen* (‘заняпасці духам’); 2) ***страх***: бел. *хаваць галаву ў пясок* (‘спалохацца, старацца ўхіліцца ад чаго-небудзь’) – ням. *den Kopf in den Sand stecken* (‘адмовіцца бачыць рэальнасць’); 3) ***шчасце***: бел. *губляць галаву* (‘не ведаць ад хвалявання як паступіць і што рабіць; безразважна, моцна закахацца ў каго-небудзь’) – ням. *j-m zu tief ins Auge geschaut haben* (‘закахацца ў каго-небудзь’).

Саматычны кампанент *язык (die Zunge)* сімвалізуе зносіны, перадачу інфармацыі, а таксама некаторыя эмоцыі, напрыклад: 1) ***страх***: бел. *язык прыліп да горла (да гартані)* (‘хтосьці змоўк, анямеў (ад страху, ад нечаканасці)’ – ням. *die Zunge verschlucken* (‘праглынуць язык’); 2) ***здзіўленне***: бел. *язык адняўся* (‘хтосьці раптам змоўк, страціў здольнасць размаўляць’) – ням. *Maul und Nase aufsperren* (‘разявіць рот ад здзіўлення’); 3) ***сорам***: бел. *язык не паварочваецца* (‘хтосьці баіцца, не адважваецца, саромеецца і не мае жадання (сказаць, зрабіць)’) – ням. *ein häßliches Wort nicht in den Mund nehmen* (‘язык не паварочваецца сказаць непрыстойнае слова’).

Саматызм *рука (die Hand / der Arm)* часцей за ўсё актуалізуе такія значэнні, як майстэрства, дзейнасць, характар, фізічны стан, аднак можа выкарыстоўвацца і для выражэння эмоцый: 1) ***жаданне***: бел. *хапацца (ухапіцца) абедзвюма рукамі* (‘з вялікім жаданнем, з радасцю’) – ням. *mit allen zehn Fingern nach etw. greifen* (‘ухапіцца абедзвюма рукамі’); 2) ***адчай***: бел. *ламаць сабе рукі* (‘адчайвацца (ад вялікага гора)’) – ням. няма аналагаў; 3) ***шчасце***: бел. *на руках насіць* (‘занадта песціць, шанаваць каго-

небудзь') – ням. *j-n auf Händen tragen* ('насіць на руках'); 4) ***здзіўленне***: бел. *разводзіць (развесці) рукамі* ('не ведаць, як выйсці з цяжкага становішча, выражаць крайняе здзіўленне ') – ням. няма аналагаў.

Саматычныя фразеалагізмы з кампанентам *зуб (der Zahn)* выражаюць у асноўным негатыўныя эмоцыі, напрыклад: 1) ***гнеў***: бел. *вастрыць (тачыць) зубы* ('ненавідзячы каго-небудзь, рыхтаваць яму якую-небудзь непрыемнасць') – ням. *auf j-n einen Zahn haben* ('мець зуб на каго-небудзь'); 2) ***хваляванне***: бел. *трымаць язык за зубамі* ('не гаварыць нічога лішняга, быць асцярожным у выказваннях') – ням. *den Mund halten* ('маўчаць').

Саматызм *валасы (die Haare)* у складзе фразеалагічнай адзінкі здольны набываць значэнне пэўнай эмоцыі, напрыклад: 1) ***страх***: бел. *валасы сталі дыбам* ('хтосьці вельмі моцна спалохаўся') – ням. *das Haar steht ihm zu Berge* ('валасы сталі дыбам'); 2) ***адчай***: бел. *рваць на сабе валасы* ('адчайвацца, вельмі моцна перажываць') – ням. *sich (D) die Haare ausraufen* ('рваць на сабе валасы').

Саматызм *нага (das Bein / der Fuß)* сімвалізуе рух, хуткасць. Устойлівыя выразы з гэтым кампанентам могуць выражаць эмоцыю *страху*: бел. *з усіх ног* ('вельмі хутка бегчы') – ням. *die Beine unter die Arme nehmen* ('бегчы з усіх ног').

Фразелагізмы з саматызмам *пятка (die Hacke)* могуць актуалізаваць эмоцыю *страху*: бел. *паказваць пяткі* ('ратавацца ўцёкамі') – ням. *sich auf die Hacken machen* ('уцякаць').

Саматызм *плячо (die Schulter)* сімвалізуе адказнасць, працавітасць, цягавітасць і можа выражаць такія эмоцыі, як: 1) ***здзіўленне***: бел. *паціскаць плячамі (плячыма)* ('выражаць здзіўленне, неразуменне, няведанне') – ням. няма аналагаў; 2) ***гнеў***: бел. *секчы з пляча* ('зліцца на каго-небудзь, крыўдзіць, не падумаўшы') – ням. няма аналагаў.

Фразеалагічныя адзінкі з іншымі саматычнымі кампанентамі сустракаюцца радзей і не заўсёды маюць аналагі ў мове супастаўлення. На аснове аналізу вышэйпералічаных фразеалагізмаў можна меркаваць, што ўстойлівыя адзінкі дзвюх моў нярэдка выяўляюць тоеснасць у семантыцы, аднак, вобразы, што ляжаць у іх аснове, могуць адрозніваецца.

 © Г. Старасціна, 2020.

Супастаўляльны аналіз фразеалагічных адзінак беларускай і нямецкай моў дазваляе нам вылучыць наступныя тыпы міжмоўнай фразеалагічнай эквівалентнасці:

1) поўныя эквіваленты, якія характарызуюцца аднолькавай семантыкай, кампанентным складам, падобнай структурай: бел. *хаваць галаву ў пясок* – ням. *den Kopf in den Sand stecken*; бел. *адводзіць вочы* – ням. *die Augen niederschlagen*; бел. *строіць вочкі* – ням. *j-m Augen machen*; бел. *вастрыць (тачыць) зубы* – ням. *seinen Zahn wetzen*; бел. *валасы сталі дыбам* – ням. *das Haar steht ihm zu Berge*; бел. *рваць на сабе валасы* – ням. *sich (D) die Haare ausraufen*;

2) частковыя эквіваленты, якія маюць тоеснае значэнне, падобную ці розную структуру і іншы кампанентны склад: бел. *мецъ сэрца* – ням. *sich (D) das Herz aus dem Leibe ärgern*; бел. *кроіць сэрца* – ням. *das Herz dreht sich mir im Leibe um*; бел. *вочы на мокрым месцы* – ням. *die Augen gingen ihm über*; бел. *язык прыліп да горла (да гартані)* – ням. *die Zunge verschlucken*; бел.*з усіх ног* – ням. *die Beine unter die Arme nehmen*; бел. *душа ў пяткі (ускачыла, схавалася)* – ням. *das Herz fiel ihm in die Hosen*; бел. *губляць (згубіць; траціць, страчваць, страціць) галаву* – ням. *j-m zu tief ins Auge geschaut haben*;

3) безэквівалентныя фразеалагізмы характарызуюцца адсутнасцю прамых аналагаў у мове супастаўлення і дазваляюць адзначыць адметныя нацыянальныя элементы моўнай свядомасці: бел. *да душы* (‘падабаецца’); бел. *пацiскаць плячамі* (‘выражаць здзіўленне, неразуменне, няведанне’); бел. *разводзіць рукамі* (‘не ведаць, як выйсці з цяжкага становішча, выражаць крайняе здзіўленне’); бел. *ламаць сабе рукі* (‘адчайвацца (ад вялікага гора)’); бел. *секчы з пляча* (‘зліцца на каго-небудзь, крыўдзіць, не падумаўшы’). Асноўнымі крытэрыямі, якія дазваляюць вызначыць тып міжмоўнай фразеалагічнай эквівалентнасці, з’яўляюцца агульны сэнс фразеалагічнай адзінкі, яе структура і кампанентны склад.

**Высновы і перспектывы далейшых навуковых даследаванняў**. Пры аналізе фактычнага матэрыялу было ўстаноўлена, што саматычныя ўстойлівыя адзінкі беларускай і нямецкай моў маюць як універсальныя, так і нацыянальна-

спецыфічныя рысы. Даследаванне паказала, што саматычныя фразеалагізмы дзвюх моў маюць шмат агульнага ў семантыцы, кампанентным складзе і валодаюць высокай міжмоўнай эквівалентнасцю. Гэта тлумачыцца тым, што саматычныя кампаненты ўваходзяць у высокачастотную, спрадвечную лексіку кожнай з моў, адлюстроўваюць агульначалавечае бачанне свету і валодаюць высокай фразаўтваральнай актыўнасцю, што павышае ступень міжмоўнай эквівалентнасці.

Як паказваюць прыклады, саматычныя фразеалагізмы як беларускай, так і нямецкай моў рэпрэзентуюць пераважна адмоўныя эмоцыі, такія як страх, сорам, смутак, гнеў, зайздрасць, адчай. Станоўчыя эмоцыі передаюцца значна радзей. Гэта адлюстроўвае падабенства беларускай і нямецкай моўнай карціны свету.

Нацыянальная адметнасць выяўляецца ў адсутнасці дакладных эквівалентаў, што тлумачыцца як лінгвістычнымі, так і экстралінгвістычнымі фактарамі. Так, шляхам супастаўлення было ўстаноўлена, што беларускамоўным фразеалагічным адзінкам з кампанентам *душа* ў перакладзе на нямецкую мову ў шматлікіх выпадках адпавядаюць фразеалагізмы з кампанентам *сэрца*. Апазіцыя душа / сэрца сустракаецца даволі часта. Таксама можна адзначыць, што адной саматычнай лексеме беларускай мовы могуць адпавядаць дзве лексемы нямецкай мовы (рука / die Hand, der Arm; нага / das Bein, der Fuß), што тлумачыцца спецыфікай моўнага чляненне свету рознымі народамі.

Такім чынам, супастаўляльны аналіз фразеалагічных адзінак дазволіў нам высветліць некаторыя ўніверсальныя і спецыфічныя рысы ўстойлівых адзінак дзвюх моў. Фактычны матэрыял будзе карысны пры складанні перакладнога слоўніка саматычных фразеалагізмаў, пры выкладанні спецкурсаў па практыцы перакладу.

**Літаратура**

1. Арцёмава В. А. Катэгорыя прасторы ў моўнай карціне свету (на матэрыяле беларускай і англійскай фразеалогіі). *Фалькларыстычныя даследаванні : Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі* : зб. навук. арт. Мінск, 2013. Вып. 10. С. 189–197.

 © Г. Старасціна, 2020.

2. Дзядова А. С. Чалавек у люстэрку беларускай фразеалогіі і парэміялогіі : манаграфія. Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2013. 161 с.

3. Іваноў Я. Я. Афарыстычныя адзінкі ў беларускай мове. Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. 208 с.

4. Коваль У. І. Фразеология народной духовной культуры : состав, семантика, происхождение : монография. Минск : РИВШ, 2011. 196 с.

5. Ковшова М. Л. Лингвокультурологический метод во фразеологии. Коды культуры. Москва : УРСС, 2016. 456 с.

6. Ляшчынская В. А. Базавыя канцэпты фразеалагічнай карціны свету : манаграфія. Мінск : РІВШ, 2015. 223 с.

7. Ляшчынская В. А. Месца і роля эмоцыі смутку ў фразеалагічнай карціне свету беларусаў. *Лінгвістика*. Луганск, 2012. № 3 (27). Ч. 1. С. 146–154.

8. Маслова В. А. Национальный характер сквозь призму языка : монография. Витебск : УО “ВГУ им. П. М. Машерова”, 2011. 76 с.

9. Старасціна Г. М. Фразеалагізмы з кампанентам *душа* ў аспекце лакунарнасці (на матэрыяле рамана Івана Мележа “Людзі на балоце” і яго перакладу на нямецкую мову). *Теоретические и практические предпосылки подготовки полилингвальных специалистов в вузе* : материалы IV Междунар. науч.-практ. онлайн-семинара. Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2018. С. 87–90.

10. Старасціна Г. М. Лакунарнасць лексемы *душа* адносна нямецкай мовы (на матэрыяле рамана Івана Мележа “Людзі на балоце” і яго перакладу на нямецкую мову). *Восточнославянские языки и литературы в европейском контексте – VI* : сб. науч. ст. Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2020. С. 254–258.

11. Старасціна Г. М. Спецыфіка рэпрэзентацыі катэгорыі эмоцый у нацыянальна-моўнай карціне свету (на матэрыяле фразеалагізмаў з кампанентам вока/вочы ў мове рамана Івана Мележа “Людзі на балоце” і яго перакладзе на нямецкую мову). *Немецкий язык – лингводидактическое обеспечение и методика преподавания* : сб. науч. ст. Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2019. С. 106–111.

12. Шаховский В. И. Лингвистическая теория эмоций : монография. Москва : Гнозис, 2008. 416 с.

13. Шубина В. П. Заметки о полевой организации соматической фразеологии в немецком языке. *Функциональный синтаксис немецкого языка* : межвуз. сб. Челябинск, 1977. С. 81–89.

**References**

1. Arcyomava V. A. Kategoryya prastory u mounaj karcine svetu (na materyyale belaruskaj i anglijskaj frazealogii). *Fal'klarystychnyya dasledavanni : Kantekst. Typalogiya. Suvyazi* : zb. navuk. art. Minsk, 2013. Vyp. 10. S. 189–197.

2. Dzyadova A. S. CHalavek u lyusterku belaruskaj frazealogii i paremiyalogii : managrafiya. Vicebsk : VDU imya P. M. Masherava, 2013. 161 s.

3. Ivanov Ya. Ya. Afarystychnyya adzinki u belaruskaj move. Magilyou : MDU imya A. A. Kulyashova, 2017. 208 s.

4. Koval' U. I. Frazeologiya narodnoj duhovnoj kul'tury : sostav, semantika, proiskhozhdenie : monografiya. Minsk : RIVSH, 2011. 196 s.

5. Kovshova M. L. Lingvokulturologicheskiy metod vo frazeologii. Kodyi kulturyi. Moskva : URSS, 2016. 456 s.

6. Lyashchynskaya V. A. Bazavyya kancepty frazealagichnaj karciny svetu : managrafiya. Minsk : RIVSH, 2015. 223 s.

7. Lyashchynskaya V.A. Mestsa i rolya emotsyi smutku u frazealagichnay kartsine svetu belarusau. *Lingvistika*. Lugansk, 2012. № 3 (27). Ch. 1. S. 146–154.

8. Maslova V. A. Natsionalnyiy harakter skvoz prizmu yazyika : monografiya. Vitebsk : UO "VGU im. P. M. Masherova", 2011. 76 s.

9. Starastsina G. M. Frazealagizmy z kampanentam dusha u aspektse lakunarnastsi (na materyyale ramana Ivana Melezha "Lyudzi na balotse" i yago perakladu na nyametskuyu movu). *Teoreticheskiye i prakticheskiye predposylki podgotovki polilingvalnykh spetsialistov v vuze* : materialy IV Mezhdunar. nauch.-prakt. onlayn-seminara. Mogilev : MGU im. A. A. Kuleshova. 2018. S. 87–90.

10. Starastsina G. M. Lakunarnasts leksemy dusha adnosna nyametskay movy (na materyyale ramana Ivana Melezha "Lyudzi na balotse" i yago perakladu na nyametskuyu movu). *Vostochnoslavyanskiye yazyki i literatury v evropeyskom kontekste – VI* : sb. nauch. st. Mogilev : MGU imeni A. A. Kuleshova. 2020. S. 254–258.

11. Starastsina G. M. Spetsyfika reprezentatsyi kategoryi emotsyy u natsyyanalna-mounay kartsine svetu (na materyyale frazealagizmau z kampanentam voka/vochy u move ramana Ivana Melezha "Lyudzi na balotse" i yago perakladze na nyametskuyu movu). *Nemetskiy yazyk – lingvodidakticheskoye obespecheniye i metodika prepodavaniya* : sb. nauch. st. Mogilev : MGU imeni A. A. Kuleshova. 2019. S. 106-111.

12. Shahovskiy V. I. Lingvisticheskaya teoriya emotsiy : monografiya. Moskva : Gnozis, 2008. 416 s.

13. Shubina V. P. Zametki o polevoy organizatsii somaticheskoy frazeologii v nemetskom yazyike. *Funktsionalnyiy sintaksis nemetskogo yazyika* : mezhvuz. sb. Chelyabinsk, 1977. S. 81–89.

*Стаття надійшла до редакції 07.09.2020 р.*
*Прийнята до друку 22.10.2020 р.*

 © Г. Старасціна, 2020.